# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ
## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 11 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.**

| № п.п. | Пытанні | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1 | Транскрыпцыя слова *сусвету* [сусв’э́ту] правільная? | | + |
| 2 | У слове *злітаю* вымаўляюцца два мяккія гукі? | | + |
| 3 | Словы *з зямлёю* утвараюць адно фанетычнае слова? | + | |
| 4 | У слове *пазнаю* колькасць літар і гукаў супадае? | | + |
| 5 | У слове *вялікага* два зычныя гукі санорныя, адзін – шумны звонкі, адзін – шумны глухі? | + | |
| 6 | У фразе 16 фанетычных слоў? | | + |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 2.**

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **А** | **4** | **Б** | **1** | **В** | **7** | **Г** | **5** | **Д** | **2** | **Е** | **6** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| *штукатурить* | ***тынкаваць*** | *отапливать* | ***ацяпляць*** |
| *мостить (камнем)* | ***брукаваць*** | *удобрять* | ***угнойваць*** |
| *сверлить (дрелью)* | ***свідраваць*** | *вспахать* | ***узараць*** |
| *переоборудовать* | ***пераабсталяваць*** | *обтёсывать* | ***абчэсваць*** |
| *остеклить* | ***зашкліць*** | *отскоблить* | ***адскрэбці*** |
| *окрашивать* | ***афарбоўваць / фарбаваць / маляваць*** | *изваять* | ***вылепіць / выразаць / высечы*** |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 4.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| | *разаўю* | | 🌲 ***развіце*** |
| 🌲 ***зацяжараць*** | | *зацяжарыце* | |
| *выняць* | 🌲 ***выму*** | | |
| *злавацца* | | | 🌲 ***злуйцеся*** |
| *растаць* | 🌲 ***растану*** | | |
| | | 🌲 ***пад’ясце*** | *пад’ешце* |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 5.**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Прыметнік, утвораны ад прыслоўя | ***унутраныя*** |
| 2 | Азначальны займеннік | ***кожнаму*** |
| 3 | Рознаспрагальны дзеяслоў | ***надасць*** |
| 4 | Назоўнік, утвораны нульсуфіксальным спосабам | ***падыход*** |
| 5 | Член сказа, якім з'яўляецца выдзеленае слова | ***акалічнасць (уваходзіць у склад акалічнасці, выражанай дзеепрыслоўным зваротам)*** |
| 6 | Часціца | ***гэта*** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал (нават калі ў адказе прапаноўваюцца 2 ці больш адпаведных пастаўленым умовам слоў). У выпадку спалучэння правільнага і няправільнага варыянтаў адказу – 0 балаў.*

**Заданне 6.**

| **№ сказа** | **Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці)** | **Выпраўлены варыянт сказа** |
|---|---|---|
| **1** | Пры лічэбніках *два, тры, чатыры* назоўнікі ставяцца ў форме назоўнага склону множнага ліку, таму правільна будзе ***два тыдні*** | *Людзі, якім патрэбна ваша дапамога… Звесткі пра іх глядзіце на сайце X ва ўкладцы "Дабрачыннасць". Інфармацыя абнаўляецца кожныя два **тыдні**.* |
| **2** | Памылка звязана з афармленнем аднародных членаў сказа з залежнымі словамі. Залежныя словы павінны мець граматычную сувязь з кожным з аднародных выказнікаў | *Мы помнім **герояў** і прыносім **ім** даніну павагі.* |
| **3** | Памылка звязана з лексічнай неспалучальнасцю слоў у словазлучэнні ***павышаць кругагляд***. Правільна: ***пашыраць кругагляд*** | *Прафесія, якая дазваляе **пашыраць кругагляд**, дае магчымасць глыбей разумець свет вакол сябе…* |
| **4** | Памылка звязана з ужываннем дзеепрыслоўнага звароту | *Спарткомплекс "Раўбічы". **Пры пад'ездзе** да Мінска добра бачны яго трампліны.* (Магчымыя іншыя варыянты праўкі.) |
| **5** | ***Лячэбны санаторый*** – плеаназм | *Санаторый N – цудоўнае месца для адпачынку!* |
| **6** | Няма памылак | – |

*За кожны правільна запоўнены радок (у тым ліку за сцвярджэнне адсутнасці памылкі) – 1 бал (0,5 бала за выяўленне і 0,5 бала за тлумачэнне памылкі).*

**Заданне 7.**

Штогод у тэрмін да 1 кастрычніка мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўзгадняюць вызначаныя спецыялізаванымі арганізацыямі пляцоўкі складзіравання снегу ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ахове навакольнага асяроддзя пры ўмове размяшчэння іх у месцах з пераважна глыбокім заляганнем грунтавых вод і недапушчэння траплення *(траплянне, пападання)* талых вод у водныя аб’екты, на азяляненыя *(азелянёныя)* тэрыторыі, прыродныя тэрыторыі, якія падлягаюць спецыяльнай ахове.

*За кожную памылку перакладу (лексічную або граматычную) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, за кожную памылку ў афармленні (арфаграфічную або пунктуацыйную) – 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

Дэпо (1, 6) → Барока (3, 7) → Рамантызм (5, 10)→ Рэалізм (4, 9) →Мадэрнізм (2, 8)

*За правільнае вызначэнне паслядоўнасці – 1 бал, за кожнае правільнае вызначэнне элемента афармлення – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| Цытата | Аўтар | Назва твора | Жанр твора |
|---|---|---|---|
| Цытата 1 | **Янка Купала** | **“Раскіданае гняздо”** | **драма / трагедыя** |
| Цытата 2 | **Іван Шамякін** | **“Сэрца на далоні”** | **раман** |
| Цытата 3 | **Максім Гарэцкі** | **“Роднае карэнне”** | **апавяданне** |
| Цытата 4 | **Якуб Колас** | **“У палескай глушы”** | **аповесць** |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Ацэнка задання складаецца з чатырох кампанентаў: веданне імя пісьменніка і яго твораў; ацэнкі афармлення гарадскіх аб’ектаў; ацэнкі прапанаванага праекта; ацэнкі цытат і тлумачэння да іх.*

*Веданне імя пісьменніка і яго твораў*

| | |
|---|---|
| Названы Пімен Панчанка і прапанаваны адзін з яго твораў | 1 бал |
| Названы Пімен Панчанка, але твор названы няправільна | 0,5 бала |
| Названы іншы пісьменнік або пісьменнік не названы | 0 балаў |

*Ацэнка афармлення гарадскіх аб’ектаў*

| | |
|---|---|
| Апісаны два прынцыпова розныя аб’екты афармлення, прапанавана іх прынцыпова рознае афармленне, якое звязана з творам, дадзена лагічнае тлумачэнне, як ідэя двух аб’ектаў афармлення звязана з ідэяй выбранага твора | 2 балы |

| | |
|---|---|
| Тыя ж патрабаванні, што і на 2 балы, але дадзена адно лагічнае тлумачэнне, як ідэя афармлення звязана з ідэяй выбранага твора (другое тлумачэнне нелагічнае або адсутнічае) | 1,5 бала |
| Тыя ж патрабаванні, што і на 2 балы, але дадзена два нелагічныя тлумачэнні, як ідэя афармлення звязана з ідэяй выбранага твора або тлумачэнні адсутнічаюць<br>АБО<br>Апісаны адзін аб'ект афармлення, прапанавана яго афармленне, якое звязана з творам, дадзена лагічнае тлумачэнне, як ідэя афармлення аб'екта звязана з ідэяй выбранага твора<br>АБО<br>Апісаны два блізкія аб'екты (напрыклад, два будынкі) афармлення, прапанавана іх прынцыпова рознае афармленне, якое звязана з творам, дадзена лагічнае тлумачэнне, як ідэя двух аб'ектаў афармлення звязана з ідэяй выбранага твора | 1 бал |
| Апісаны адзін аб'ект афармлення, прапанавана яго афармленне, якое звязана з творам, дадзена нелагічнае тлумачэнне, як ідэя афармлення аб'екта звязана з ідэяй выбранага твора або тлумачэнне адсутнічае<br>АБО<br>Апісаны два блізкія аб'екты (напрыклад, два будынкі) афармлення, прапанавана іх прынцыпова рознае афармленне, якое звязана з творам, дадзена нелагічнае тлумачэнне, як ідэя двух аб'ектаў афармлення звязана з ідэяй выбранага твора або тлумачэнне адсутнічае | 0,5 бала |
| Не выканана ні адна з умоў задання або адказ адсутнічае | 0 балаў |

*Ацэнка прапанаванага праекта*

| | |
|---|---|
| Прапанавана апісанне, як праект зменіць успрыманне горада жыхарамі і гасцямі ў сувязі з выбраным творам. Для апісання праекта выкарыстана не больш за 100 слоў | 1 бал |
| Прапанаваная ідэя афармлення гарадской прасторы звязана з вызначаным творам, але няма апісання, як гэта зменіць успрыманне горада жыхарамі і гасцямі, і / або для апісання праекта выкарыстана больш за 100 слоў<br>АБО<br>Прапанавана апісанне, як ідэя афармлення зменіць успрыманне горада жыхарамі і гасцямі, але яна не звязана з вызначаным творам і / або для апісання праекта выкарыстана больш за 100 слоў | 0,5 бала |
| Прапанаваная ідэя афармлення гарадской прасторы не звязана з вызначаным творам, няма апісання, як праект зменіць успрыманне горада жыхарамі і гасцямі | 0 балаў |

*Прапанаваныя цытаты:*

| | |
|---|---|
| Прапанавана правільная цытата, дадзена лагічнае тлумачэнне, чаму выбрана менавіта гэтая цытата | 1 бал за кожную цытату |

| | |
|---|---|
| У цытаце маюцца нязначныя фактычныя памылкі (перастаўлены словы, заменена ці апушчана слова і падобнае), дадзена лагічнае тлумачэнне, чаму выбрана менавіта гэтая цытата<br>АБО<br>Прапанавана правільная цытата, але дадзена нелагічнае тлумачэнне, чаму выбрана менавіта гэтая цытата, або тлумачэнне адсутнічае | 0,5 бала за кожную цытату |
| У цытаце маюцца нязначныя фактычныя памылкі (перастаўлены словы, заменена ці апушчана слова і падобнае), дадзена нелагічнае тлумачэнне, чаму выбрана менавіта гэтая цытата, або тлумачэнне адсутнічае<br>АБО<br>Адказ адсутнічае | 0 балаў за кожную цытату |